# Малітва на кожны дзень (16)

Аўтар: Рэдакцыя
04.12.2016 00:00

Малітва на Адвэнт

Усемагутны Божа, забяры ад мяне ўсе высакамерныя думкі, жаданне ўласнай хвалы, зайздрасць, прагнасць, абжорства, ляноту і распуснасць, пачуццё гневу, жаданне помсты, хаценне няшчасця іншым або радасць з гэтай прычыны, адчуванне асалоды ад злосці і гневу бліжніх ці задавальнення ад абвінавачвання і зневажэння кагосьці няшчаснага і абяздоленага. Ва ўсіх маіх дзеяннях, словах і думках адары мяне, добры Божа, сэрцам пакорным, сціплым, ціхім, згодным, цярплівым, міласэрным, ласкавым, чулым і літасцівым, каб я спазнаў Святога Духа. Дай мне сапраўдную веру, моцную надзею і палымяную любоў. Такую любоў да Цябе, якая непараўнальна пераўзыходзіла б замілаванне да самога сябе. Каб не любіў нічога, што магло б Табе не спадабацца, а ўсё, што люблю, каб любіў у Табе.

Амэн.